© Пачатковае навучанне: сям’я, дзіцячы сад, школа № 1/2025

***Дудзінская Л. У.***, *настаўніца пачатковых класаў Дружылавіцкай сярэдняй школы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці*

# Вуснае дзяленне на цэлыя дзясяткі з астачай

## Матэматыка. IV клас

| Прыклад | Адказ | Літара на зорцы |
|---|---|---|
| **600 : 30** | 20 | Н |
| **250 : 5** | 50 | К |
| **260 : 20** | 13 | Д |
| **360 : 90** | 4 | О |
| **240 : 80** | 3 | Р |
| **720 : 9** | 80 | У |
| **888 : 2** | 444 | К |
| **2960 :10** | 296 | Т |
| **808 : 2** | 404 | О |
| **1000 : 40** | 25 | Ы |

| |
|---|
| **1454 год — упершыню ўпамінаецца вёска Дружылавічы ў даравальным запісе.** |
| **У 1777 г. пабудаваная Свята-Мікалаеўская царква ў Дружылавічах, унесеная ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.** |
| **1783 — у гэтым годзе ў вёсцы Ляскавічы пабудаваная царква Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, якая з'яўляецца помнікам народнай архітэктуры.** |

| |
|---|
| **1825 — у гэтым годзе ў вёсцы Чакуцк (зараз Шчакоцк) быў закладзены куб. У перыяд з 1816 па 1855 г. у розных частках Еўропы было закладзена 265 кубоў. Вучоныя стварылі Дугу Струвэ для таго, каб вызначыць форму і памер зямнога шара. Зараз на гэтым месцы памятны знак, стэла з чорнага граніту з шарам, які сімвалізуе Зямлю.** |
| **1943 — у гэтым годзе ў 100 метрах ад вёскі Трылiскі загінуў Мікалай Барскі, удзельнік партызанскага руху. Сёння імя Мікалая Барскага носіць цэнтральная вуліца вёскі Трылiскі.** |

| |
|---|
| **1957 — у пасляваенны час у вёсцы Замошша быў пабудаваны новы цагельны завод, а ў 1973 г. на прадпрыемстве ўжо працавалі 150 рабочых, за год выпускалі 4 мільёны цэглы. На жаль, прадпрыемства зараз няма.** |
| **1974 — 1 верасня 1974 г. Дружылавіцкая школа ўпершыню сустрэла вучняў. У мінулым годзе мы святкавалі юбілей.** |

***Заданне на картках.***

Карыстаючыся данымі табліцы, рашы задачу.

З Дружылавіцкай школы выехаў аўтамабіль са скорасцю 82 км/г. Да горада Іванава ён праехаў ____ км, а потым з той жа скорасцю ад Іванава ехаў да Брэста. Колькі гадзін аўтамабіль быў у дарозе ад Дружылавічаў да Брэста?

| Напрамак | Адлегласць, км |
|---|---|
| Трыліскі — Іванава | 14 |
| Дружылавічы — Іванава | 12 |
| Замошша — Іванава | 15 |
| Ляскавічы — Іванава | 3 |
| Іванава — Брэст | 152 |

